*Варшава, 4 чэрвеня 2020 г.*

Шаноўнае Спадарства,

Дарагія беларускія сябры,

У часе распаўсюджвання ў свеце пандэміі SARS-CoV-2, якая паграджае кожнаму без выключэння, перасякаючы з палахлівай хуткасцю палітычныя і геаграфічныя межы, мы разам стаім перад вялікім выпрабаваннем – выпрабаваннем для агульналюдзкай салідарнасці.

Бо менавіта адзіным магчымым адказам на гэтую ўніверсальную пагрозу павінна быць салідарнасць людзей, народаў і дзяржаў. Толькі такім чынам, мужна і салідарна, разам мы можам супрацьстаяць пагрозе.

Мы, жыхары Польшчы, асаблівым чынам адчуваем патрэбу ў дапамозе нашым усходнім суседзям, з якімі нас аб'ядноўваюць моцныя і глыбокія гістарычныя сувязі, штодзённае супрацоўніцтва ў розных сферах дзейнасці, а таксама спадзяванне і жаданне паспяховай будучыні. Грамадства Беларусі мае ў нас адданых і гатовых да дзеяння партнёраў.

Сёння Фонд міжнароднай салідарнасці, з'яўляючыся інструментам палітыкі развіцця Рэспублікі Польшчы, ужо другі раз арганізаваў і перадае рэальную дапамогу для жыхароў Беларусі. Гэта фінансаваныя польскімі кампаніямі сродкі для барацьбы з каронавірусам – антысептычныя і дэзінфікуючыя вадкасці, ахоўныя маскі, камбінезоны, рэспіратары, тэсты і іншыя сродкі асабістай аховы. Мы маем надзею, што перададзеныя Рэспубліканскаму цэнтру арганізацыі медычнага рэагавання сродкі будуць служыць патрабуючым, але перад усім тым, хто, стоячы у гэтай барацьбе на першай лініі, падвяргаецца найбольшай рызыцы – лекарам, медсёстрам, медычным ратаўнікам і ўсім іншым супрацоўнікам беларускай сістэмы аховы здароўя.

Фонд міжнароднай салідарнасці заўсёды спасылаўся ў сваіх дзеяннях на дыпазіт каштоўнасцяў вялікага грамадзянскага руху „Салідарнасць", які ў 80-ыя гады спрыяў перамозе незалежнасці ў гэтай частцы Еўропы, разбурэнню падзелаў паміж Усходам і Захадам, стварэнню прасторы бяспекі і даверу.

Няхай гэты канвой медыцынскай дапамогі будзе доказам нашай волі і гатоўнасці да ўзвядзення мастоў узаемаразумення паміж палякамі і беларусамі.

З павагай,

Рафал Дзенцялоўскі

Старшыня праўлення

Фонду міжнароднай салідарнасці

Fundacja Solidarności
Międzynarodowej

Solidarity Fund PL

Biuro/Office:
Wołodyjowskiego 69A
02-724 Warszawa
www.solidarityfund.pl

KRS: 0000024453